ПАЭЗІЯ

## Міхась Башлакоў

# У РАДАСЦІ БЫЦЬ РАЗАМ І Ў ЖУРБЕ

*Вершы*



***Башлакоў Міхась Захаравіч*** нарадзіўся 27 красавіка 1951 года ў пасёлку Станцыя Церуха (цяпер вёска Баштан) Гомельскага раёна. Вучыўся ў Грабаўскай сярэдняй школе. У 1968 годзе паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт ГДУ, пасля заканчэння якога ў 1973—1978 гадах працаваў у вясковых школах на Гомельшчыне і Браншчыне. У 1978—1985 гадах выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школах Гомеля.

Пасля пераезду ў Мінск у 1991—2005 гадах працаваў галоўным метадыстам у Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь, актыўна займаўся падрыхтоўкай і выданнем 145-томнай гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць».

Аўтар кніг паэзіі «Касавіца» (1979), «Дні мае залатыя» (1993), «Як слёзы горкія Айчыны…» (1999), «Матчыны грыбы перабіраю» (2000), «Світальныя коні» (2001), «Пяро зязюлі падніму» (2001), «Нетры» (2004), «Палын. Чарнобыль» (2005), «Віно адзінокіх» (2011), «Музыка нязваная» (2014), «Далеч вячэрняя» (2017), «На зветраных шляхах» (2020) і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2009).

* * *

Жыццё, відаць, ужо не райскае:
Злятаюць дні — ліст за лістком...
І ўспамінаю неба майскае
Над тым, наіўным хлапчуком...

Было так ціха і лагодна,
І за акном цвіў пышна бэз,
І не было мне так гаротна,
Бо іншым быў мой інтарэс...

Махаў крыламі сон світальны —
І я ў тым сне кудысьці плыў...
Прамень зіхоткі і крыштальны
Траву расяную срабрыў...

Не знаў яшчэ я горкіх ісцін,
Яшчэ не сніў я горкіх сноў...

Гады мае пажоўклым лісцем
Не асыпаліся далоў...

Але ж усё ў жыцці часова...
«Дзе той хлапчук, — гукаю, — дзе?»
І промень сонца вечаровы
Зіхціць на счэрненай вадзе...

◆ ◆ ◆

І сіл няма спяваць узнёсла песні:
Натхнёныя, відаць, мінулі дні...
Я слухаю, як плача над узлессем
Самотны клін у хмарнай вышыні...

З чым параўнаць мелодыю расстання —
Найдаражэйшы міг маёй зямлі?..
Курлычуць у сярэбраным тумане
Любімыя з маленства жураўлі...

Душа мая хлапечая шчымела,
Калі я чуў дзівосны гэты плач...
«Вяртайцеся», — шаптаў услед нясмела,
Жадаючы ў палёце ім удач...

І клін страйнеў ад добрых пажаданняў,
І радаваўся шчыра я ў душы,
І доўга ўсё махаў на развітанне
У восеньскай прасветленай цішы...

Крык жураваў — паэзія вышыняў...
І, можа, я паэтам стаў такім,
Што праз жыццё пранёс клін жураўліны,
Як самы светлы, яркі успамін?..

І вось стаю і слухаю ў тумане
Шчымліва-развітальнае «курлы» —
Ляцяць, ляцяць кудысьці на змярканні
Любімыя з маленства жураўлі...

◆ ◆ ◆

Асенні дзень. Асенняя журботы.
Жаўцеюць астры за маім акном.
І пчолы напаўняюць свае соты
Ужо апошнім восеньскім цяплом...

Душа спакойна далі сузірае.
Што хвалявацца?.. Што кудысь ляцець?..

І крочыць шляхам восень залатая...
Чаго яшчэ, чаго яшчэ хацець?..

Не трэба мне ні нечае спагады,
Тым больш не трэба нечае маны...
Стаю я на пагорку, а над садам
Гамоняць жураўліныя званы...

Як гэты клін, удаль гады злятаюць,
Ды толькі не вяртаюцца назад...
Ці птушкам, ці гадам услед махаю,
І агаляе дрэвы лістапад...

Але душа абудзіцца ў цянётах:
(Спакойна жыць, відаць, не для мяне...),
Як матылёк, ірвецца на свабоду,
За пыльным шклом трапечацца ў акне...

◆ ◆ ◆

Душа асеніцца, як клёны,
Самотна жоравам крычыць
Ці, нібы дожджык манатонны,
Бясконца плачацца ўначы...

І мне не спіцца, зразумела...
Які там сон?.. Хіба заснеш,
Калі баляць душа і цела,
І недзе заблудзіўся верш?..

І ты бяссільны нешта зрушыць...
Што можаш ты адзін зрабіць,
Калі мялеюць нашы душы,
Калі паўсюль зямля гарыць?..

Свет памяняўся... Спусташэнне...
Жабрацтва духу і душы...
Ці людзі мы?.. Ці толькі цені
На гэтым крайнім рубяжы?...

Душа, як дожджык, штось шаманіць
На ўзмежку восеньскага дня...
І мроіцца, нібы ў тумане,
Світальных промняў чысціня...

◆ ◆ ◆

Як бяздумна душу сваю трачу
Ці то ў радасці, ці то ў бядзе...

ПРОЗА

## Зіновій Прыгодзіч

# ЧАРОМХАВЫЯ ХАЛАДЫ

*Аповесць*



***Зіновій Кірылавіч Прыгодзіч*** нарадзіўся 15 кастрычніка 1944 года ў вёсцы Лышча Пінскага раёна. Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі Белдзяржуніверсітэта працаваў у газеце «Звязда», у ЦК КПБ, галоўным рэдактарам газеты «Советская Белоруссия», першым намеснікам старшыні Дзяржкамдруку Рэспублікі Беларусь. Цяпер — галоўны рэдактар часопіса «Гаспадыня».

Друкавацца пачаў у 1957 годзе. Аўтар кніг прозы «Журба мая светлая» (2002), «Крымская сімфонія» (2005), «Путь полной луны» (2009), «Родник у лесных берез» (2011), «Постаці» (2011) і інш., а таксама зборніка вершаў «Калі б не ты» (2002).

Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2017).

Алесь Пятровіч, былы супрацоўнік рэспубліканскай газеты, а цяпер пенсіянер, глядзеў па тэлевізары вячэрні выпуск апошніх навін, калі нечакана пазваніў унук Міколка.

— Дзядуля, можна я да цябе на хвілінку завітаю?

— Канешне, можна. Чаго ты яшчэ пытаешся?

— Ну, ці мала што. Раптам ты нечым пільным займаешся...

— Давай прыходзь.Чакаю.

Міколка — старэйшы ўнук Алеся Пятровіча. І, бадай, самы любімы. Не, ён любіў і сваіх унучак — Алёну і Кацю, але то былі дзяўчаткі, і з імі ў дзеда, вядома ж, было куды менш агульных інтарэсаў. А з Міколкам ён з самага яго дзяцінства гуляў у розныя гульні, у школе памагаў пісаць сачыненні, а калі той вучыўся ва ўніверсітэце — падсабляў матэрыяльна. Але дзеда з унукам збліжала не толькі гэта. У іх была еднасць больш высокая — духоўная. Алесь Пятровіч прывучаў Міколку да сур'ёзнай літаратуры, заахвочваў яго, тэхнара, праграміста, да размоў, а часам і даволі эмацыянальных дыскусій пра важныя жыццёвыя праблемы, далікатна, неназойліва накіроўваў яго маральна-духоўнае станаўленне. З гадамі ў іх склаліся цёплыя, даверлівыя адносіны. Яны нават сталі вельмі падобныя адзін да аднаго — што знешне, што характарам. Многімі сваімі сакрэтамі ўнук дзяліўся толькі з дзедам.

І вось яны сядзяць за кухонным сталом і нетаропка п'юць чай. Вядуць ціхую, нязмушаную размову. Алесь Пятровіч цішком прыглядваецца да ўнука, які сёння чамусьці ўсхваляваны больш чым звычайна, і адчуваецца, што хоча расказаць нешта важнае, але чамусьці вагаецца.

Нарэшце Алесь Пятровіч запытаўся напрамую:

— Міколка, у цябе штосьці здарылася?

— Ды не... Нічога асаблівага... — збянтэжыўся той. — Проста хацелася б параіцца... Памятаеш, я табе расказваў пра Віялету, сваю былую аднакурсніцу?

— Памятаю. Ты нават картку яе паказваў. Прыгожая дзяўчына.

— Дык вось... Мы дружым з ёю ўжо другі год, а я ніяк не магу зразумець, што яна за чалавек. Нейкая скрытная, капрызлівая. З-за гэтага пастаянна сварымся, пакутліва высвятляем адносіны. А цяпер мне здаецца, што мы падышлі да той мяжы, калі трэба вызначацца: альбо сыходзіцца і быць разам, альбо разбягацца канчаткова... Што ты мне параіш, дзядуля?

— А што ж я магу табе, унучак, параіць? Гэта павінен вырашаць ты сам. Толькі ты і ніхто іншы.

І, гледзячы на засумлены твар унука, Алесь Пятровіч усміхнуўся:

— Не перажывай, Міколка. Не ты першы трапляеш у такую сітуацыю, не ты апошні... Хачу табе даць пачытаць адну рэч.

Алесь Пятровіч падняўся з-за стала, накіраваўся ў свой кабінет і праз хвіліну выйшаў адтуль з тоўстым сшыткам у цёмна-сіняй вокладцы.

— Гэта мой дзённік студэнцкай пары. Вазьмі пачытай. А пасля мы прадоўжым нашу размову.

Дома Мікола, умасціўшыся ў мяккае крэсла, разгарнуў дзедаў сшытак і паглыбіўся ў чытанне...

Нядзеля. У хаце — цішыня.

За акном ідзе мяккі, бухматы снег...

Я — дома. Сесія, пяць экзаменаў якой даліся мне няпроста, засталася ззаду. На душы прыемная палёгка. І з-за таго, што ўсе экзамены здаў на выдатна, і з-за таго яшчэ, што наперадзе чатыры месяцы вольніцы. Ні лекцый, ні практычных заняткаў, ні залікаў. Толькі доўгачаканая практыка ў абласной газеце «Заря». Брэст я выбраў не выпадкова. Там вучыцца ў пэдінстытуце Надзя, мая каханая. І ўсе чатыры месяцы мы будзем побач! І ад гэтага на душы светла, радасна.

Хаця адносіны нашыя цяжка назваць бязвоблачнымі. Вось ужо шосты год, як мы, кажучы па-народнаму, жаніхаемся, а яснасці пакуль аніякай. Наадварот, з кожным годам адносіны становяцца ўсё больш заблытаныя, пакутлівыя, няпэўныя. Мы бясконца сварымся, мірымся, зноў сварымся. Надзя па-ранейшаму застаецца для мяне незразумелай, загадкавай, а яе ўчынкі часам мала паддаюцца здароваму сэнсу. Вось чаму на гэтую практыку ў мяне вялікія надзеі. Будучы побач такі працяглы час, я спадзяюся, што мы нарэшце прыйдзем да нейкага канкрэтнага рашэння.

Аднак ехаў я дадому з трывожным пачуццём. Баяўся, што, як і на ранейшых канікулах, мы зноўку з-за якога-небудзь непаразумення пасварымся, і тады ўсе мае мары-спадзяванні на практыку пойдуць прахам.

На шчасце, усё склалася інакш. Яна вельмі тонка адчувае мой настрой. І на гэты раз была добразычлівая, прыветлівая. Вечарам, калі зайшоў па яе, каб разам пайсці ў кіно, яна чамусьці ўжо ляжала ў пасцелі.

— Ай, нікуды не хочацца ісці...

Тады распрануўся і я. Сядзім, гаворым, а ў галаве ў мяне б'ецца, не сунімаецца думка: «Запытаюся вось зараз, ці кахае яна мяне, і калі адкажа, што «не» — сыду і справе канец».

Пачалі балавацца. Я выключыў настольную лямпу. Яна прамаўчала. Тады прысеў на ложак, абняў яе, і раптам адчуў трапяткія дрыжыкі ў яе целе. Гарачая, нястрымная хваля пачуцця захліснула мяне, і я прагна прыпаў да яе вуснаў...

Гэта былі хвіліны, якія рэдка здараюцца ў маім жыцці. Я кіпеў, я гарэў, мне хацелася плакаць, смяяцца ад шчасця. Я цалаваў яе вусны, шчокі, вочы, валасы, і захмялела, страсна шаптаў:

— Родная мая... Каханая... Надзейка...Скажы, ты хочаш, каб мы заўсёды-заўсёды былі разам?

Яна на нейкае імгненне застыла, а пасля парывіста абвіла мяне за шыю і прытулілася моцна-моцна.

Словам, усе канікулы мы правялі разам. Не абышлося, канешне, без прыкрых сварак, але ўсё ж добрага, прыемнага было куды больш. Разам мы прыехалі і сюды, у Брэст.

У рэдакцыі мяне сустрэлі надзвычай добразычліва. Галоўны рэдактар, хударлявы, пажылы ўжо мужчына, доўга і зацікаўлена распытваў: хто я, адкуль, ці маю які вопыт газетнай працы? І чамусьці абрадаваўся, калі я сказаў, што два гады працаваў у раённай газеце.

— Ну што ж, — заключыў ён свае роспыты, — вы прыглядайцеся да нас, а мы будзем прыглядацца да вас. А на практыку прызначу вас у ідэалагічны аддзел. Не палохайцеся — загадчыкам там у нас вельмі творчы, таленавіты чалавек, Васіль Аляксандравіч. Я ўпэўнены, вам з ім будзе не проста цікава, а і карысна папрацаваць. Пазнаёміцеся з літаратурным работнікам гэтага аддзела Анатолем Гараем, маладым паэтам. Дарэчы, у аддзеле часта збіраецца наша творчая моладзь, ідуць гарачыя дыскусіі. І з гэтага боку вам будзе цікава. Так што, поспехаў! Калі што — заходзьце, мае дзверы для супрацоўнікаў заўсёды адчыненыя.

Васіль Аляксандравіч аказаўся чалавекам надзвычай занятым. Ён сядзеў за сталом увесь у нейкіх паперах, заклапочана іх перачытваў, хмура перакладваў, тасаваў, пры гэтым не перастаючы пыхкаць цыгарэтай.

— Так, мне толькі што званіў галоўны... — падняў ён галаву на маё прывітанне. — Прабачце, я зараз у запарцы. Знаёміцца будзем крыху пазней, а пакуль ідзіце ўладкоўвайцеся ў інтэрнат. З кіраўніцтвам інстытута дамоўлена. Гэта тут недалёка, па вуліцы Ленінскай. Заўтра з раніцы прыходзьце на працу, прыкінем вашыя планы на бліжэйшы час.

Зірнуўшы ў паперку, якую мне даў Васіль Аляксандравіч, я ледзь не ўскрыкнуў ад радасці: гэта быў адрас Надзінага інтэрната! Значыць, мы будзем з ёю жыць не толькі ў адным горадзе, але і ў адным інтэрнаце. На такую ўдачу я нават не разлічваў. Гэта — добры знак!

І першая, нечаканая непрыемнасць. Мы — пасварыліся.

А пачалося ўсё вось з чаго. На канікулах Надзя мне расказала, што яе бліжэйшая сяброўка Вольга гаварыла ёй пра мяне, нібыта я зусім не такі, якім мяне ведаюць, што я гуляка і падманшчык, і г.д. і т. п.

У першы ж дзень, пры засяленні ў інтэрнат, я сустрэў Вольгу ў калідоры інтэрната: яна таксама вучыцца ў педінстытуце. Яны з Надзяй былі аднакласніцамі і разам паступілі ў педагагічны.

Я быў непрыемна ўражаны такой характарыстыкай: што Вольга можа пра мяне ведаць? Мой блізкі сябар Іван, які сустракаецца з Вольгай, наўрад ці мог такое пра мяне нагаварыць. Значыць, тут нейкі разлік. Яе родны брат Аркадзь, першы на вёсцы гарманіст і весялун, адзін час меў да Надзі пэўны інтарэс. І я нават сур'ёзна раўнаваў да яго, але Надзя пераканала мяне, што нічога, акрамя сяброўскіх адносін, у іх няма. Тым не менш у Аркадзя, відаць, засталіся больш далёкія планы. І з дапамогай сястры ён вырашыў пасварыць, развесці нас з Надзяй.

І вось, сустрэўшы Вольгу, я не выцерпеў, запытаўся, што яна думае пра мяне. Вольга імгненна ўспыхнула:

— Надзя сказала, так?

— Якая розніца... — пачырванеў я і зразумеў, што дапусціў вялікую памылку.

Надзя мне гэтага не даруе.

І сапраўды. Недзе праз паўгадзіны яна зайшла ў мой пакой. Раздражнёная, злая.

— Ну што? — працяла мяне ледзяным, пранізлівым позіркам. — Выпытаў? Дазнаўся? Так я і ведала! Знайшла каму расказваць! Як ты толькі мог? Пабег, як вясковая баба, высвятляць адносіны... Што ж, гэта мне навука. Дадумаўся! У мяне ў галаве не ўкладваецца...

Я сядзеў, як пабіты. Няшчасны, прысаромлены, марна спрабуючы апраўдацца:

— Зразумей, як усё атрымалася...

— Не хачу нават слухаць! Які сорам! Не, відаць, ты сапраўды не такі... Як жа я магу пасля гэтага табе нешта расказваць? І наогул, як я магу табе верыць?

Я ўзарваўся:

— Ну і не трэба! Калі табе Вольга даражэйшая за мяне, то аб чым размова?

Я падняўся з крэсла, падышоў да акна. Слёзы пякучай крыўды набеглі на вочы. На некалькі хвілін у пакоі ўсталявалася гнятлівая цішыня.

Надзя, як заўсёды, імгненна адчула мой настрой. І загаварыла ўжо зусім іншым тонам:

— Ну, зразумей — яна пасля гэтага скажа мне: «А, ты ўсё роўна ўсё расказваеш...» А мы ж сяброўкі. Давяралі адна адной калі не ўсё, то вельмі многае. А ты? Як ты мог?

Яна нібыта яшчэ працягвала мяне ўшчуваць, але ў голасе ўжо не было ранейшага ледзянога холаду і раздражнення. Я паглядзеў на яе. У вачах зацеплілася прыкметная пяшчота і нешта ад мацярынскага дакору. У мяне радасна тарганулася сэрца.

«Родная мая! — хацелася абняць яе і прашаптаць: — Даруй, калі ласка. Я ўчыніў страшэннае глупства. Больш такое ніколі не паўторыцца...»

Нешта падобнае я і сказаў. У рэшце рэшт, мы памірыліся. Але расталіся ўсё роўна халаднавата.

Я заўсёды крыўдую і амаль абураюся, калі Надзя не дазваляе сябе цалаваць.

— Гэта не абавязкова, — кажа яна. — Мне дастаткова пасядзець побач, пагаварыць — і ўсё...

А мне — не дастаткова! А я так не магу! Калі цалаваць толькі для таго, каб чмокнуць вуснамі, шапнуць нейкую банальнасць, то я першы аднёсся б да гэтага з пагардай. А мне ж хочацца ўкласці ў пацалунак усё цяпло сваёй душы, усю буру пачуццяў. Пацалунак — гэта самае высокае, самае шчырае прызнанне ў каханні, яго нямы, утрапёны крык.

Канкрэтнага задання мне ў рэдакцыі пакуль не далі. Сказалі, што будуць думаць, але параілі, каб думаў і я, шукаў свае тэмы. І тут я ўспомніў адзін даўні эпізод са сваёй працы ў раёнцы.

...Напрадвесні 1961 года ў рэдакцыю Лагішынскай раённай газеты «Калгасная праўда», дзе я тады працаваў карэспандэнтам, прыйшоў ліст з Давыд-Гарадка. Пісалі юныя следапыты сярэдняй школы № 1:

«Добры дзень, дарагая рэдакцыя!

Мы, вучні старэйшых класаў, пад кіраўніцтвам настаўніка гісторыі Ніколенка Ц. А. паглыблена вывучаем гераічныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета мы вырашылі наведаць партызанскія мясціны, дзе ў 1943-1944 гадах ваяваў Цімафей Андрэевіч. І было гэта якраз у вашым раёне. Вельмі просім, каб хто-небудзь з вашых карэспандэнтаў далучыўся да нашай экспедыцыі. Мы будзем у вас на пачатку ліпеня...»

Суправаджаць юных давыд-гарадоцкіх следапытаў рэдактар даручыў мне, як самаму малодшаму супрацоўніку рэдакцыі.

— Табе гэта будзе цікава, — заключыў ён, уручаючы камандзіроўку. — А можа, нават і карысна.

І адпусціў на цэлы тыдзень. Разам з Ніколенкам, былым камісарам партызанскага атрада, і яго выхаванцамі мы пабывалі ў маім родным Лышчы, суседніх вёсках Забараўцы і Пучыны, больш далёкіх Ліпніках і Пагост-Загародску. Сустрэліся з былымі партызанамі, партызанскімі сувязнымі, мясцовымі жыхарамі, якія сваімі ўспамінамі хораша дапоўнілі падрабязнасці і дэталі баявых аперацый. Рэдактар не памыліўся: гэта было не толькі цікава, але і сапраўды карысна. Я пражыў у раёне сямнаццаць гадоў, аднак пра многае, што адбывалася тут у гады вайны, не ведаў і не чуў.

Пазней з Ніколенкам я сустракаўся яшчэ ў Давыд-Гарадку, спісаў цэлы агульны сшытак ягонымі ўспамінамі. Словам, сабраў даволі багаты і цікавы матэрыял. Але сталася так, што я тады так нічога і не напісаў: на дакуметальную аповесць фактаў было замала, а для нарыса — мнагавата.

Добра, што захапіў з сабою гэты сшытак: як адчуваў, што ён мне спатрэбіцца. Перачытаў свае запісы і зразумеў, што можа атрымацца неблагі нарыс. Цяпер, напярэдадні 20-годдзя Перамогі, такія матэрыялы ў газеце запатрабаваны.

Нарыс напісаўся лёгка, на адным дыханні. Была якраз нядзеля, выхадны, і я спакойна, з ранку да вечара, змог плённа папрацаваць. Атрымалася мнагавата — ажно дзесяць старонак, спісаных уборыстым почыркам. Скарачаць не стаў: мне падалося, што там усё да месца.



ПАЭЗІЯ

## Станіслаў Валодзька

# ЛАСТАЎКІ НАД АКНОМ

*Вершы*

***Валодзька Станіслаў Віктаравіч*** нарадзіўся 11 лістапада 1956 года ў вёсцы Падольцы Астравецкага раёна. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1987). Працаваў на чыгунцы. Цяпер жыве і працуе ў Даўгаўпілсе (Латвія). Аўтар паэтычных кніг «У вачах Айчыны» (1996), «Памяці гаючая трава» (2000) і інш.

Узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» і медалём Францыска Скарыны.

### ЛАСТАЎКІ НАД АКНОМ

Радасць у сэрцы зноў
Ластаўкаю шчабеча.
Ластаўкі над акном
Помніцца будуць вечна.

Ластаўкі над акном.
Мы ім радня таксама,
Бо і для іх наш дом
Лепшы і мілы самы.

Ластаўкі над акном,
Перш чым падацца ў вырай,
З неба жагнаюць дом,
Нас асяняюць шчыра.

А як з краёў чужых
Ластаўкі прылятаюць,
Мы сустракаем іх
І, як радню, вітаем.

Ды не вярнуць гадоў...
Зараз ляцім таксама

З выраю ў родны дом
Ластаўкамі мы самі.

Бачым наш дом гняздом
Па-над акном азерца...
Як і ў маленстве, зноў
Радасць шчабеча ў сэрцы.

## БАГАЧ

Прыйшоў Багач — кідай рагач,
Бяры сявеньку і сей памаленьку.

*Прымаўка*

Рагоча месячык — рагач,
З-за хмарак сонейка смяецца,
Што зноў да нас прыйшоў Багач
Сявенькай поўнай цешыць сэрца.

Ў сявеньцы свечку, гаспадар,
Запальвай і падзякуй Богу
За ураджай,
За шчодры дар
Яго вялікую падмогу.

І хай паможа Бог табе
Пад ураджай на лета новы
Закласці добрую аснову
З сявенькай гэтай на сяўбе.

Ды ёсць сявенька і ў душы,
Дзе зерне слоў найлепшых самых,
І свечка ў ёй гарыць таксама,
Каб багачом ты век пражыў...

## ІГНАСЕЎ САД

З маленства помню сад Ігнасеў
На ўскрайку вёскі,
Што застаўся
Як напамінак аб тым часе,
Як раскулачвалі Ігнася.

Кулак, — не фіга быў,
За тое
Ў Сібір вывозілі сям'ёю.
І гэты сад заломваў рукі
І лісцем гнаўся ўслед за ёю...



ПРОЗА

**Уладзімір Мароз**

# ЗАБРАННІКАЎ БЕРАГ

*З аповедаў жыцця*

***Мароз Уладзімір Вікенцьевіч*** нарадзіўся 11 чэрвеня 1953 года ў горадзе Косава Івацэвіцкага раёна. Скончыў архітэктурны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута і Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага ў Маскве. У кінематаграфіі з 1981 года: старшы рэдактар Дзяржкіно БССР, вядучы рэдактар студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» (1988—1998). Цяпер— вядучы рэдактар дакументальнага кіно кінастудыі «Беларусьфільм». Аўтар дваццаці пяці кніг паэіі, прозы, эсэ, сярод якіх «Голас», «Рэй», «Хутаранская зорка», «Беларускі храм», «За брамай забытых мелодый», «Дабрадаць», «Шляхцянка-восень», «Крыжы на ростанях», «Графічная кніга паэта» і інш. Лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2015).

У маёй творчай кайстры ёсць верш «Плыты на Нёмане» — згадкі нават не з дзяцінства, з маленства. Уся карціна, калі плыты выкіроўваюць з-за выгіну ракі каля Кумы (затока), кіруюць каля Клешчыц (лугавы трохкутны бераг, просты кут якога і складае рачны выгін) і потым спыняюцца на мелкаводдзі пад пясчанай гарою (Амброжыкава гара) правага берага Нёмана, даўно ўжо страціла якую-кольвек рэальнасць, ператварылася ў вобраз, што назаўсёды з табою. Плытагоны з прысамі (доўгі гладкі адпаліраваны рукамі тонкі хваёвы кій, каб адштурхоўвацца ад дна і ад берага), сярод якіх і мой дзед Костусь, перакус, які прынесла баба Маня свайму мужу, на рассцеленым абрусе на лугавой мураве — перапынак з плытамі якраз дзеля перадыху і абеду. О, як было б цудоўна зняць плыты на Нёмане для дакументальнага кіно! Але дзе там — калі перасталі ганяць тыя плыты, сплаўляць лес у Мемель-Клайпеду? Недзе ў другой палове пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя, калі я яшчэ і ў школу не хадзіў, а летаваў, як было заведзена, са старэйшым братам у бабы з дзедам у Мікалаеўшчыне. Магчыма, я быў сведкам якраз апошняга лесасплаву? А мо калі хто і здымаў кінасюжэт?

Як тое ні было, але калі ўжо сам быў у кінадакументаліскім званні, родны Нёман каля Коласавай і маёй Мікалаеўшчыны не крыўдзіў — даволі кадраў было тут знята для розных дакументальных фільмаў. І назбіралася іх восем,

амаль дзесяціна з майго сцэнарнага даробку ў дакументальным кіно за сорак без малога гадоў працы. Бясспрэчна, Нёман прыгожы і непаўторны паўсюль у сваім цячэнні ад вытокаў да Балтыйскага мора. Але дзе ж ты згледзіш усю раку даўжынёй звыш дзевяцісот кіламетраў, нават калі ўзяць толькі беларускую частку, якая складае палову гэтай працягласці? Жыцця не хопіць. Таму кожны, хто мае хоць нейкую (радзінную ці набытую) сувязь з глыбіннай беларускай ракой, аддадзены пэўнаму яе адрэзку, у маім выпадку мікалаеўскаму, дзе зусім недалеч ад згаданай пясчанай гары стаіць дзедаў хутар, які мне з братамі застаўся ў спадчыну. Адно што засмучае праз імклівыя нястомныя гады і дзесяцігоддзі, дык гэта тое, што, застаючыся на месцы, Нёман аддаляецца ад цябе змяненнем сваіх краявідаў, у выніку чаго мясціны і берагі твайго дзяцінства ўжо, бывае, і не пазнаць — пазарасталі непраходным хмызняком. Асабліва шкада, што і ад пясчанай гары засталіся толькі дзве невялікія лапінкі з драбнюткім пяском, які спякотным летнім днём награваецца так, што босай нагой не ступіць. У летнюю гарачую пару тут людзей як гароху, як на добрым курорце. Астатні схіл перахапілі вербалозы, у такіх месцах і да берага не працерабіцца. І, тым не менш, аўра адвечнай ракі засталася ў сваёй моцы, захаваліся толькі твае маляўнічыя куточкі, якія вельмі хораша кладуцца ў выяўленчую тканіну кінастужкі, калі патрэбны натуральныя краявіды, якія павінны несці пэўную сэнсавую нагрузку.

Першыя мае тры фільмы як сцэнарыста, дзе з'яўляўся Нёман і прынёманскія мясціны, здымаліся яшчэ ў мінулым стагоддзі, на кінаплёнку. Адлікам стаў 1991 год, стужка «Іван Насовіч». Чамусьці справа была зімою — з-за холаду не самы прыемны час для здымкаў, але прыгожы, адметны, зімовыя краявіды не частыя госці ў нас на экране. Не, мы не здраджвалі прынцыпу кінадакументалізму — здымалі ў родным для Насовіча Мсціславе, а каб паказаць яго ордэны і медалі, ездзілі нават у Санкт-Пецярбург, прарваліся ў Эрмітаж, дзе нам вынеслі для здымкаў царскія ўзнагароды пад пільнай аховай. Але знайшлося месца ў фільме і для іншых мясцін. Справа ў тым, што рэжысёр задумаў гульнявую сцэну, дзе акцёры забаўляюцца народнымі загадкамі і адгадкамі, тым самым хацеў падкрэсліць цікавасць Насовіча да беларускай этнаграфіі, якая шырока прадстаўлена ў яго знакамітым слоўніку беларускай мовы. Але ж акцёраў трэба недзе сабраць у аўтэнтычнай атмасферы! Вось так і надарыліся Акінчыцы, мемарыяльная хата, дзе нарадзіўся Якуб Колас. Дазволілі.

Натуральна, і ў Мікалаеўшчыну варта пад'ехаць, калі ўжо блізка — зняць некалькі нёманскіх краявідаў. Да таго ж мне проста хацелася пазнаёміць рэжысёра і аператара з роднымі мясцінамі. Накіраваліся ў Дубы (урочышча на беразе Нёмана), дзе ў савецкі час у дзень народзінаў Коласа праводзіліся шматлюдныя паэтычныя фэсты. Цяпер там зімна і ціха, прыгажосць адмысловая. Знялі дыск сонца праз галіны, прайшліся па беразе. Рака пад ільдом, але ў адным месцы пасярэдзіне рэчышча трымціць палонка — прадаўгаватая, невялікая, але прыкметная. Дык гэта ж эратычны кадр... Аператар, чалавек ужо даволі сталага ўзросту, загарэўся, улёгся на беразе на снег і доўга прыладкоўваўся з кінакамерай, каб зняць арыгінальны план. Застудзіцца на снезе не збаяўся, вынік быў варты — такога кадра больш не знойдзеш нідзе. Не тое, што яго больш ніколі ў прыродзе не трапіцца, проста трэба ўмець яшчэ і бачыць. А ў фільме на гэты кадр рэжысёр паклаў якраз прымову-прысушку дзяўчыны. Усё сышлося.

У той год у мяне здарыўся і камерцыйны праект — фільм аб калгасе «Радзіма Якуба Коласа», у які ўваходзіла і Мікалаеўшчына. Назва атрымалася лапідарнай, але канкрэтнай — «На родине Якуба Коласа». Час быў такі, свабода, шмат хто заказваў фільмы — разумелі ці не разумелі, што хоць так у гісторыі застанешся. З цяжкасцю, але выбраўся я да старшыні калгаса Канстанціна Каробкі з нейкай сваёй мікалаеўскай просьбай, а тым часам і аб заказе пагаварыць. Іншая справа не залатвілася, а вось на фільм ён згадзіўся. Старшыня быў з тых кіраўнікоў, якіх у савецкія часы называлі «чырвонымі панамі». Як тут не станеш ім, калі ты на пасадзе (як аказалася на заканчэнне працоўнага шляху) сорак адзін (!) год, калі кіруеш усім і нічога не здараецца на гэтых землях без тваёй згоды. Не адкінеш, зроблена шмат, але і самаўладства навідавоку. Падпісалі дамову, напісаў сцэнарый. А здымаў фільм малады рэжысёр, не па ўзросце, а таму, што гэта была яго першая самастойная работа. Папраўдзе, у здымкі я не соваўся, убачыў толькі гатовы фільм, дзе старшыня шкадаваў, што Савецкі Саюз распаўся. Але мяне тое не пераймала — грошы я зарабіў, сведчанні для гісторыі пакінуў. Мой дзядзька Міша са сваёй Соняй-Даміцэляй у пэўным эпізодзе былі. Паколькі фільм заказны, у архіў не здавалі, толькі заказчыку аддалі дзве копіі на кінаплёнцы. Напэўна, недзе і ляжаць тыя копіі ў канторы ў Любкаўшчыне ці ў іхнім Доме культуры — але дзе ж ты будзеш шукаць іх? Таму не памятаю, ці быў Нёман у стужцы, але думаю, што рэжысёр абавязкова павінен быў зняць раку, без якой размова шмат у чым губляе сэнс.

Тым не менш фільм паслужыў мне добрую службу. Тады, на пачатку дзевяностых, некаторыя зразумелі, што варта прыдбаць кавалак зямлі ў курортнай хваёвай мясціне каля Нёмана, хіба што толькі мы слаба даганялі. Але, калі Каробка пераараў палову нашага агарода, каб відавочна дакляраваць, што землі калгасныя (а яны насамрэч такімі не былі, лясніцтву належалі, потым ужо сельсавет камандаваць пачаў), гэта было звыш. Паехаў я да старшыні, узмуціўся, націснуў на свядомасць — што ж ты робіш? І пакінулі наш агарод у спакоі, толькі высілкаў каштавала, каб тое груба пераараннае згладзіць, давесці да ладу. А потым паўсталі і пытанні з суседзямі, якія неўзабаве з'явіліся каля нашага хутара — два палкоўнікі з унутраных войскаў. Ім сказалі выбраць зямлю, дзе спадабаецца, і ўзяць яе. Яны і выбралі. Дык вось, тая палова агарода таксама меркавалася на ўчасткі, а яшчэ і суседзі рваліся адхапіць ад нашай тэрыторыі. Гэта было крыўдна, бо зямля была адпачатку дзедава, купленая ў Радзівіла — але ж саветы ўласнасці не прызнавалі. Таму і давялося на пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя адстойваць свае межы, націскаць, напрыклад, на тое, што гэтыя сосны садзіў дзед Костусь, і мы аніяк не можам аддаць іх чужым. Так удалося адваяваць тэрыторыю на паўгектара, псіхалагічна прасторы даволі. А з суседзямі зжыліся, адносіны павярнуліся на добрыя, часта і за сталом разам збіраліся. Хіба што апошнім часам стасункаў акрамя вітання праз агароджу (найлепшы сусед за плотам!) практычна не стала — найперш таму, што палкоўнікі ўжо адышлі з гэтага свету. Асабліва прыкметна адсутнасць гасціннага Валеры Іванавіча...

Паслухай, братка, ты зусім забыўся на галоўную дзеючую асобу аповеду — Нёман! А ён нікуды і не дзеўся, гэта дзякуючы яму, жоўтаму чыстаму пясочку ды хваёваму гаючаму лясному водару, мясціна бясспрэчна курортная, таму людзі імкнуцца сюды адхапіць свой кавалачак зямнога раю. А для нас гэта з

самага дзяцінства проста жыццё. Толькі адчуваць і разумець яго філасофію і экзістэнцыю ты з часам пачынаеш усё больш востра і глыбінна.

Неўзабаве, у 1993 годзе, надарыўся фільм «Крыж ля дарогі», адметны набытак у маёй кінематаграфічнай кайстры. На свае вочы ўбачыўшы, як з паўстаннем незалежнай Беларусі вокамгненна адрадзілася народная традыцыя ставіць на расстайных пуцявінах і каля селішчаў крыжы-абярэгі, вырашыў зняць пра гэта дакументальны фільм. І ўдалося! Тут не буду згадваць усю гісторыю, яна склала аповед «Крыж на хутары», падсумую толькі аб Клешчыцах. О, якая гэта была чыстая і прыгожая зялёная лугавая мясціна, якую Нёман агінаў прастакутна! Колькі мы з дзедам сакавітай травы перакасілі тут на сена для нашай кароўкі! Колькі шчупакоў трыгубіцай злавілі ў глыбокай азярыне, якая ўжо бліжэй да лесу і да вайны была таксама ва ўласнасці дзеда! І Нёману падабаліся мяккія лугавыя берагі, а сам кут, насупраць якога на другім беразе быў заход у таямнічую затоку Кума, быў пазначаны нешырокай пясчанай касой, як быццам кавалак чыстага пясчанага дна вытыркнуўся на бераг. Дык вось, на гэтым выгіне мы і ўпадабалі месца для начнога (так патрабуе традыцыйна-метафізічны пратакол) вырабу крыжа. Расклалі вогнішча, святла якога было для кінаплёнкі ўсё ж замала. Таму побач стаяў і працаваў ліхтваген, ваенны аўтамабіль-электрастанцыя. Анягож, нягледзячы на тое, што фільм у выніку толькі дзесяць хвілінаў, падыход быў на высокім узроўні, як у мастацкім кіно. У начным дзействе сваю ролю выконваў і Нёман — то я на чайцы праплыў-праехаў па вадзе (выпадковы сведка быццам), то дзядзька Міша Куцейка (галоўны мой арганізатар чыну) забрыў у ваду і спаласнуў твар ад поту, то конь з драбінамі, на якіх сасна прыехала на бераг, турзаўся ў раку напіцца. Жыццё кіпела, вынікам якога быў непаўторны кадр з выробленым сякерамі гатовым светлым крыжом на беразе.

Нараніцу здымалі яшчэ, як жонка дзядзькі Мішы цётка Соня палошча ў Нёмане за бортам лодкі быццам бы сатканы за ноч ручнік. Са сцэнаю начнога ткання меліся праблемы — дзе знайсці ў Мікалаеўшчыне кросны? Мо ў каго і ляжалі недзе на гарышчы? А нам трэба, каб яны былі ў рабоце. Выратавала іншая мемарыяльная Коласава сядзіба — Смольня, дзе кросны меліся як экспанат і нават у рабочым стане. Там з мікалаеўскімі жанчынамі і знялі начны (таксама па пратаколе) эпізод прання-ткання. Але ў вадзе паласкаўся ручнік звычайны, фабрычны, з чырвоным арнаментам — зрэбнага проста не знайсці. Далей я папрасіў рэжысёра зняць кадр высокага пясчанага нёманскага берага з вываратнямі-карэннямі сосна ў. Вада на выгіне падмывае пясчаны бераг, карэнне берагавых дрэў агаляецца, і з часам яны падаюць у ваду. Такі вось непрыдуманы драматызм у прыродзе. Рэжысёр аніяк не згаджаўся, бо бераг той пачынаўся за Клешчыцамі, непасрэднага дачынення да кінематаграфічнага дзейства не меў. «Але ж прыгожа!» — даводзіў я. Калега нарэшце здаўся, папрасіў аператара для адчэпнага зняць кадр. І што — вельмі хораша стаў ён у карціне! Так у маіх фільмах упершыню з'явіўся Забраннікаў бераг, як я назаву гэтую мясціну пазней. Дарэчы, ён даў натхненне маёй дачцэ Марыне, якая неўзабаве пасля заканчэння Акадэміі мастацтваў стварыла графічную нізку «Мой бераг», дзе самае моцнае ўражанне пакідала аголенае карэнне над адхонам — дрэвы вырачаныя ўпасці ў ваду, але пакуль чапляюцца за жыццё. Няхай і позна, але я параіў ёй пераназваць гэты цыкл якраз як «Забраннікаў бераг».

**Мікола Трус**

# АПОВЕСЦЬ ІВАНА ЦАНКАРА «БАТРАК ЕРНЭЙ І ЯГО ПРАВА» (1907) У БЕЛАРУСІ: РЭЦЭПЦЫЯ, ПАСРЭДНІЦТВА, КАНТЭКСТ

***Трус Мікалай Валянцінавіч*** — загадчык Цэнтра энцыклапедычных выданняў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.



**Іван Цанкар (Ivan Cankar). Пачатак XX ст.**
**Фота Аўгуста Бертальда (Avgust Berthold).**
***З сайта Дыгітальнай бібліятэкі Славеніі — dlib.si.***

У 1920—1930-х гг. кніга замежнага аўтара, якая выходзіла ў Мінску, апыналася адразу ў двух кантэкстах — рэспубліканскім і дзяржаўным, а таксама ў агульнай мультыкультурнай сістэме і з адзіным эпіцэнтрам беспрэцэдэнтнага сацыяльнага эксперыменту. Працэс гэты не быў спарадычным, пад пільным кантролем знаходзілася адпаведнасць творчасці канкрэтнага аўтара ідэйна-эстэтычным прыярытэтам маладой Краіны Саветаў.

Публікуючы матэрыялы да 100-годдзя Івана Цанкара (1876—1918), класіка славенскай літаратуры, часопіс «Иностранная литература» (1976, № 5) наступным чынам рэпрэзентаваў шаноўнага юбіляра: «Яго шырокая творчасць — проза, драматургія, публіцыстыка, літаратурная крытыка, паэзія — прасякнута духам барацьбы супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, глыбокай, трапяткой чалавечнасцю і адзначана высокай мастацкай дасканаласцю» [1, с. 160]. І яшчэ адна вытрымка з тэксту названага перыядычнага выдання, што непасрэдна выводзіць нас на запатрабаваны гэтым разам твор: «Яго іранічны, горкі талент адкрыў новую старонку ў славенскай літаратуры. Ён нёс з сабой адчай і праклёны тых, хто з жахам думае пра заўтрашні дзень, чыю чалавечую годнасць гняце і ламае самазадаволены буржуа. Ён гаварыў аб пратэсце, які спее ў нетрах цёмнага царства, аб пад'ёме народных мас (аповесць «Батрак Ернэй і яго права», 1907)» [1, с. 160].

Сярод найбольш значных выданняў Івана Цанкара — раман «Марцін Качур. Жыццяпіс аднаго ідэаліста» («Martin Kačur. Življenjepis nekega idealista», 1907), зборнікі апавяданняў «Віньеткі» («Vinjete», 1899), «Кніга для легкадумных людзей» («Knjiga za lahkomiselne ljudi», 1901), «Вобразы са сноў» («Podobe iz sanj», 1917), камедыі «Для народнага дабрабыту» («Za narodov blagor»,

1901), «Кароль Бетайновы» («Kralj na Betajnovi», 1902) і інш.

Аповесць «Батрак Ернэй і яго права» («Hlapec Jernej in njegova pravica», 1907) — адзін з ключавых момантаў біяграфіі аўтара. Прытым не толькі творчай. У 1907 г. Іван Цанкар балатаваўся на выбарах у аўстра-венгерскі парламент ад сацыял-дэмакратаў Славеніі, шмат выступаў перад рабочымі. Пралетарыят дружна падтрымліваў свайго вылучэнца, але перамогу атрымаў кандыдат ад народна-прагрэсіўнай партыі, найбольш папулярнай у куды больш шматлікім сялянскім асяроддзі. У напружаныя дні канкурэнтнай барацьбы ўзнікла задума самага вядомага твора, перакладзенага на многія еўрапейскія мовы. Паводле ўласнага прызнання аўтара, ён хацеў напісаць агітацыйную брашуру да выбараў, а ў выніку атрымалася яго найлепшая навела.




**Іван Цанкар «Батрак Ернэй і яго права». Любляна, 1907 г.**
***З сайта Дыгітальнай бібліятэкі Славеніі — dlib.si.***

Пры вызначэнні жанру твора перакладчыкамі, выдаўцамі і літаратуразнаўцамі быў апрабаваны шырокі спектр вызначэнняў: апавяданне, аповесць, раман і інш. Думаецца, найбольш карэктнай будзе гаворка пра своеасаблівы жанравы сінкрэтызм, паколькі традыцыі народнага эпасу ў названым творы таксама прасочваюцца.

Пасля сарака гадоў парабкавання Ернэй выправаджаны з заможнай сялянскай сядзібы ў белы свет. Пакрыўджаны на маладога гаспадара, ён ідзе шукаць праўду ў старасты, суддзі, святара, імкнецца патрапіць і да самога імператара. Наіўнае хаджэнне героя паўсюль суправаджаецца кпінамі, смехам і ў рэшце рэшт арыштам. Ернэй вяртаецца ні з чым, падпальвае драўляныя пабудовы, а раззлаваны люд кідае яго самога ў полымя пажару.

Так выглядае кароткі змест твора, сюжэт якога добра нам вядомы па псеўдафальклорных, але пры гэтым хрэстаматыйных казках савецкага перыяду, у якіх пошукі праўды ў дакастрычніцкі час вядуцца селянінам, рабочым, салдатам (у розных варыяцыях герояў).

На радзіме пісьменніка аповесць была ўспрынята як нечаканы крок у творчай біяграфіі аўтара. Адна з першых рэцэнзій належыць пяру Ёсіпа Таміншэка (Josip Tominšek). У артыкуле, апублікаваным на старонках часопіса «Ljubljanski zvon» (1907, № 12), адзначалася, што на змену містычным настроям, катэгарычнаму стаўленню да традыцыйнай творчасці прыйшла «проста ідавочная яснасць нават у больш чым празрыстых структурах» [2, с. 755]. Рэцэнзент у сваіх ацэнках выйшаў на значныя абагульненні і высновы: «Бясцэнны дар Цанкара вось у чым: кожная рэч становіцца цікавай у яго руках; ён заваёўвае яе

цалкам і ведае, як прааналізаваць так, каб яна захапіла нас… У гэтым плане ён самы народны пісьменнік, калі бярэцца за нейкі знаёмы матэрыял: апрацоўвае яго менавіта так, як павінна быць распрацавана тут; ён таксама самы агульны касмапаліт, таму што кожная суб'ектыўная з'ява ў яго малюецца з такой аб'ектыўнай, псіхалагічнай рэальнасцю, каб было зразумела ўсюды, дзе жывуць людзі. <…> Такім чынам, "Батрак Ернэй" — аўтэнтычны тутэйшы, з нашага асяродку, у пошуках законнага права карыстацца вынікам сваёй працы ён, перш за ўсё, — чалавек, таму ўсё, паказанае ў творы, куды больш важнае і ўплывовае» [2, с. 766].

## З гісторыка-літаратурнага экскурсу

Гістарычнай адметнасцю на шляху беларуска-славенскага культурнага спазнання ў XX ст. была пастаянная змена грамадска-палітычных парадыгм, рухомае месца ў іх нацыянальнага складніка: самаідэнтыфікацыі, мінарытарнасці (меншасці), аб'ектна-суб'ектных узаемадачыненняў і інш.

Пасля Першай сусветнай вайны, распаду Аўстра-Венгерскай імперыі (1918) адным з новых дзяржаўных утварэнняў на яе былой тэрыторыі стала Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 года — Югаславія). Пасля Другой сусветнай Югаславія ўжо не каралеўства, а федэратыўная дзяржава, у склад якой уваходзіць шэсць рэспублік: Сербія, Харватыя, Славенія, Македонія, Чарнагорыя, Боснія і Герцагавіна.

Паводле згаданай вышэй юбілейнай публікацыі ў часопісе «Иностранная литература», Іван Цанкар у Савецкім Саюзе 1970-х гадоў рэпрэзентаваўся як югаслаўскі славенскі пісьменнік. Дзякуючы перакладам Ніла Гілевіча ў гэты час у Беларусі ён паўстае ў іпастасі перыяду сваёй няўрымслівай маладосці. На творчым рахунку славенскага аўтара першы і адзіны паэтычны зборнік — «Эротыка» (1899), які прадстаўляе яго ў кантэксце нацыянальнай «мадэрны», генерацыі пакалення канца XIX — пачатку XX стагоддзя, якое ўзяло курс на радыкальнае абнаўленне вобразна-выяўленчага арсеналу айчыннага мастацтва. У зборніку «Маці мая, Славенія. Выбраныя старонкі славенскай паэзіі XIX—XX стагоддзяў» (1976) змешчаны тры вершы Івана Цанкара: «***Ты прайшла ля маёй хаты міма», «***Дзе і калі маладосць прамільгнула?», «Урачыстасць у Варшаве. (На адкрыццё помніка Міцкевічу ў 1898 г.)».

У гісторыі беларускай рэцэпцыі славенскай прозы назіраецца прабел больш чым у палову стагоддзя. Аповесць «Батрак Ернэй і яго права» ананімна перакладзена з «расійскае мовы» ў 1929-м. Наступныя выданні кніжнага фармату з'явяцца ў Мінску пры паўнамоцным культурным пасрэдніцтве вядомага югаславіста Івана Чароты: творы Бены Зупанчыча (1983), Прэжыхава Воранца (1986), Ёсіпа Юрчыча (1986), Драгі Янчара (1990).

## У пошуках першакрыніцы

Напрыканцы 1920-х гг. славенская літаратура патроху асвойваецца на беларускіх землях па абодва бакі дзяржаўнай мяжы. У Заходняй Беларусі гэтаму спрыяюць студэнты чэхаславацкіх ВНУ. «Еўропа ў мініяцюры», як на-

## Вячаслаў Адамчык

# ДЗЁННІКІ. 1987—88 ГГ. СШЫТАК 4.

***Субота, 14 лістапада 1987 года.***

Вярнуўся з «Іслачы» аўтобусікам, спакусіўшы шафёра пяцёркай. Якраз у самы дождж. І вымак ужо ў горадзе, бегаючы ад кіёска да кіёска і шукаючы вераснёвы нумар «Кур'ер ЮНЕСКО».

На стале знайшоў Міраславава апавяданне. Коратка і таленавіта напісана. Міраслававa дарога — навелістыка.

Глянуў выдавецкі план, і зрабілася горка... Якая слабая наша літаратура — з нацыянальнай яна ператвараецца ў абласную рускую і ўжо нікому не патрэбную.

***Нядзеля, 15 лістапада 1987 года.***

Запісаць няма чаго, хіба гадкія сны.

Над горадам, над яго чырвонымі дахамі, якія бачу з свайго пятага паверха, плывуць сівыя, з белаватымі прагаламі хмары.

Некалі ў такую пору я збіраўся дадому ў Варакомшчыну. Здаецца, і цяпер помню гаркавата-сыры пах тапалёвага і грушавага лісця і чырвона-сырых алехавых дроў, складзеных пры тыльняй сцяне хаты.

«Wszystkoprzeszło» (вшыстко пшэшло) — як пісаў Міцкевіч у санеце «Da Niemna».

***Панядзелак, 16 лістапада 1987 года.***

Дзве гадзіны ночы, а я не сплю, і вось прыйшоў у свой кабінет, каб запісаць у дзённік і паскардзіцца самому сабе. Бо хто пачуе скаргу?

І хіба адзін Бог.

Над горадам цішыня, у якой маё напружанае вуха ловіць глухі і ледзь выразны грукат цягніка, і сівыя з цёмнымі ямамі, падсвечаныя гарадскімі агнямі, таксама маўклівыя, хмары.

У суседнім доме адно над адным свецяцца праз пераплеценае галлё дрэў тры шырокія акны пад'езда.

*(Алоўкам на адвароце — накіды па-руску, нешта накшталт хронікі пра вайну, верагодна, вытрымкі з ваеннага дзённіка, пра які гаворка далей; цяжка разабраць почырк):*

*Генеральские шевроны и красные лампасы*
*Меня обдало комяками земли и оглушило*
*Танки тяжелые К-13 и Т-26*
*17 Горьковская дивизия ра... в приграничном*

*Танковый батальон и артиллерийский полк*
Первый — третий
Второй — ....
Наблюд. пунктспирал. труба, телеф.
14 октября 1941 года глубь Москвы. Снег.
*(Далей ідуць даты, неразборліва пазнакі падзей, адзнакі пра надвор’е)*

***Аўторак, 17 лістапада 1987 года.***

Кіслы з волкім туманам дзень, кіслы і мой настрой — не браўся за пяро. Рэдакцыйны клопат забраў некалькі маіх старонак.

Чытаю дзённік вайны. У Маскве 7 лістапада 41-га вуліцы засыпала снегам, 13-га ўжо мароз 13°, 21 студзеня 1942 года — 35°, 3 студзеня 42-га — 35°.

Успомніўся марозлівы перадкалядны вечар — мы беглі з школы, і ў мяне скачанелі рукі, і я не мог раскінуць прарэх, і мае шарачковыя здубянелыя порткі змакрэлі, як помню, перад маленькай яўрэйскай хаткай, у якой гарэў агонь. У гэтую хатку да яўрэя-краўца мы неяк заходзілі з бацькам. Нізенькі дробны кравец якраз падстрыгаў ножніцамі сваю сівую шчаціну. Ён сказаў, нават не павярнуўся ад люстэрка, што стаяла на стале, што ўжо не да шыцця... Вайна, ён нават не ведае, што яго чакае заўтра.

1942 год. 5 красавіка — Вялікдзень.

Прачытаўшы ў дзённіку гэтую фразу, я ўспомніў пару акупацыі, калі наша сям’я пасля спалення вёскі жыла ў Наваельні, у атынкаваным белым доме, і бацька збіраўся да цэрквы, убачыўшы, як туды ўжо пабег паляк Ліцьвінскі, што зрабіўся нечакана праваслаўным; успомніўся і першы велікодны дзень, калі зайшоў у хату да свайго равесніка, а там у хаце на стале (помніцца, пад аранжавым абажурам), засланым абрусам, незлічоная колькасць пірагоў, вяндліны, страў, фарбованых яек... І я, галодны, тады глытаў толькі слінку. Барыс так і не адламаў мне кусок пірага, хапаючы са стала сабе і сваёй сястры.

Успомнілася і другая местачковая хата — дзе ўжо за полуднем, за сталом сядзела сям’я. І я згаладалы, забыўшыся пра далікатнасць, ажно павіс над міскаю, з якой дыміўся парам смачны расольнік.

О, як добра я помніў сваю крыўду, што за сталом, дзе са смакам сёрбалі расольнік, маладая паўнявая гаспадыня нават для прыліку не запрасіла мяне за абедны стол.

Цяпер, калі я ўбачу старую Карданіху — ужо адзінокую — з рабою чорна-белай каровай на повадзе каля шашы, у местачковай закурэлай канаве, я заўсёды ўспомню яе сына, ужо нябожчыка Барыса, што замалада памёр ад сухотаў, і адначасна ўспамінаю сваё дзяцінства пагарэльцаў. Знайшлі мы прытулак у апусцелым доме недалёка ад чыгуначнага дэпо. Дарэчы, насупраць гэтага, яшчэ ацалелага дома, акружанага новымі прысадамі і тым самым клёнам, што вышугаў у вялікае дрэва, яна і стаіць пры пярэстай чорна-белай карове.

Але адна бяда, як кажуць, не ходзіць: маладым, недзе адразу пасля вайны, трапіўшы ў турму, памёр яе муж, потым — сын, потым — захварэў на голаў і памёр меншы. І вось яна адзінокая, старая гадамі кабета, пры старой карове...

***Серада, 18 лістапада 1987 года.***

Да паўночы — часопісы. Пераглядзеў, а тое-сёе і прачытаў. Але карысць з усяго гэтага малая.

Трэба было б рыхтавацца да Яські з-пад Вільні. Зрабіць хоць выпіскі, пабыць у сутарэннях кляштара. І нейкі лад і парадак зрабіць на сваім стале — лішнія паперы, кніжкі завалілі мяне. Пішу заўсёды, паклаўшы сшытак на стос папер.

За акном туманец, што схаваў далёкі мікраяён, вільгаць, мокрыя чырвоныя дахі з камінамі, з ражнамі тэлеантэн, на якіх сядзяць вароны, і абвешаны шматкамі мокрых карычневых носікаў голы ясень, дзе пераскоквае па чорным галлі белашчокая сініца.

Уночы сны. Вочы чырвоныя, як налітыя кроўю, і шчымяць, рэжуць.

Прынеслі польскія плыты ў жаўтлявых канвертах, як з цэмянтовых мяхоў, з цёмна-сінім надпісам «UniversalWilno, ul. WielskaNr9 — tel. 12-83».

*(Малюнкі плыты, прайгравальніка, выяваў з плытаў, надпісы з этыкетак па-польску):*

*Najlepszeaparatyojnowskeplytyowio˛ k...y wybo˛r*

*...*

*(Цяжка разабраць)*

І плыты фірмы Odeon

*(Таксама надпісы з плытаў і малюнак)*

11[25] Раптоўнай, але жаданай светлай радасцю зірнула на мой стол нізкае сонца, і засерабрылася раса на пруцці маладых чорных дрэў (учора вечарам ліў патопны дождж), заблішчалі мокрыя дахі.

***Чацвер, 19 лістапада 1987 года.***

З-за высокіх хмар, сівых і цяжкіх, нарэшце вызірнула сонца, і хочацца ісці роснаю мяккаю дарогаю ўздоўж зялёнай руні, чорнага высокага быльніку на недагледжаным пры ляску полі і бачыць гэты белы, прасвечаны сонцам туман.

Разумею ўжо, як хацелася жыць маці, калі яна бачыла ясны свет парнога асенняга цяпла, сонца, мокрых у іскрыстай расе і чорных дрэў... *(Малюначак дрэва)*

А я сёння бачыў разложыстыя кашлатыя хвоі, што выраслі ў адзіноце.

Сонца белае і вялікае, і, як месяц, не яркае, тусклаватае. Сівая, разбэрсаная з яснымі прасветамі хмара і галубенькі, светлы кавалачак неба.

Да паўночы не спаў. Зноў мой сон адабралі часопісы: «Кур'ер ЮНЕСКО» і розная драбяза нашых выданняў.

Вярнуўся з дачы з наколатымі рукамі — як у каросце — абвязваў грушку і яблыньку лапкамі з елак. Ехалі туды на машыне ў жаўтлява-каламутны дождж ці, дакладней, праз такую хмару, што навісла ўжо за горадам каля возера.

Вярнуўся з Прэзідыума СП. Нібы страціў часціну душы, праспрачаўшыся і заступіўшыся за маладняк. (...)

Стары, жаўтлявы ў твары і белы, як лунь ужо, Б. прасіў выдаўцоў выпусціць падручнік для маладажонаў, бо вялікі рэзерват прастытутак на Палессі. Няўжо стары енерал забыўся, што ў нас не выданы ўсе нумары газет К. К.

Яго, бачыце, ён сказаў, непакояць маладыя прастытутачкі.

Падручнік «малжэнства», можа, і патрэбны, толькі ні Б. і ні прастытуткам, якіх, дарэчы, прывезлі на Беларусь з Ленінграда.

***Пятніца, 20 лістапада 1987 года.***

Не сплю ажно да звону ў вушах. Другая гадзіна ночы. Ціш, адно чуваць лопат нейкага нібы «дзвіжка», матора.

Навелку «Удава» трэба скончыць тым выпадкам, што адбыўся ў нашым мястэчку год трыццаць назад: жонка, схаваўшыся з каханцам на гарышча, запарола віламі мужа, калі ён туды лез па драбінцах. І ён не прызнаўся нікому, таіўся і памёр ад гэтай раны.

Марудна пішу «Фаіну Грамычыну». І які з мяне будзе работнік, калі я сёння не высплюся.

Памажы мне, Божа, знайсці спакой. Душу маю ўлагодзь. Як маліцца да цябе? Каб хоць не хадзіць у СП, не рваць свае нервы, не глядзець на сівых, ужо здзяцінелых енералаў, і моўчкі, і абыякава абыходзіць іх. Езуіцтва... якое яно жывучае ў іх. Літаратура — нешта іншае, далёкае ад енералаў, і не мае нічога супольнага з імі...

Якая стамлёнасць, млявасць і разбітасць, нібы я разгрузіў вагон цэменту (а было і такое). Не магу ўзяцца за працу. Бяссонніца дае сябе знаць.

Збегаў у магазін, нібы трохі ажыў... Купіў бутэльку алею і чарніла. Сіняе, а то прыходзіцца пісаць зялёным.

***Субота, 21 лістапада 1987 года.***

Пятая гадзіна ночы, не сплю я ўжо з чатырох ці нават з трох і таму прыйшоў у свой настылы кабінет запісаць скаргу.

Думалася пра драбнату людзей, асабліва ў нашым СП. Сакратарыят — гэта маладыя прайдзісветы... Як мне скончыць «Фаіну Грамычыну», каб вярнуцца да чацвёртай кніжкі рамана. У выдавецтвах перавыдаюць сябе работнікі гэтых жа выдавецтваў, Барадуліны ператвараюцца ў Брыдуліных і колькі разносяць плётак на іншых, асабліва маладзейшых літаратараў.

І ніякая паводка не змые гэтай жабінай густа-дрыготкай ікры, што прыліпла да выдавецкіх берагоў.

Апавяданне пра тых, хто паехаў з нашай вёскі, нават у Амерыку, даўнейшых («Срочка», Вінцэсь) і пра сённяшніх, хто не вярнуўся дадому з Казахстана, Омска, Украіны, Данбаса...

Дадому на свята, яшчэ ўсё за акольцам сала, ды і памагчы пасадзіць ці выкапаць бульбу, укасіць атаваны прыязджаюць з блізкіх Баранавіч, ды і то з кожным годам радзей, бо з кожным годам паміраюць іхнія старыя бацькі. Так неўпрыкмет, паціху зводзіцца наша вёска. І не толькі мая Варакомшчына, а ўся беларуская. Горад праглынуў і пераварыў яе.

Адседзеў у чарзе ў фрызерні, абышоў паштамт, магазін падпісных выданняў, дзе стаіць не раскуплены Быкаў, дарэчы, ужо пяты год. Не купляюць і Дастаеўскага, і Сакалова-Мікітава... Ды ці ўсіх пералічыш. І мы зноў на паліцы ставім чарговыя выданні ўсёй нашай броўкаўшчыны. Нібы знарок, каб абняславіць беларускае мастацкае слова. А маладая літаратура, здольныя паэты і празаікі будуць чакаць свайго выдання, пакуль не асівеюць.

А за акном пасля нейкай ліпучай морасі заімжыў дожджык з дробным сняжком. І крупою засыпаны край чырвонага даху — ён сівы.

Успамінаецца зноў далёкая восень, маё дзяжурства каля чорнага вісячага тэлефона з ручкаю і двума батарэйкамі, што вісеў у сельсавеце, у кабінеце сакратара, сухотнага дробненькага Чувака, успамінаецца і званок сярод ночы, калі я толькі прыдрамаў, старшыні сельсавета, былога лётчыка з абпа-

ленымі рукамі, збітага пад Баранавічамі, недзе з райцэнтра і яго строгае, трохі вайсковае запытанне, чаму я не падымаю трубкі, чаму не адказваю на званкі.

Дзяжурылі ў сельсавеце — тым местачковым прасторным доме, дзе была нават свая кутузка — падвал і кабінет участковага, ці як ён называўся на чорнай з бронзавай фарбай таблічцы, што была прыбіта да карычневых дзвярэй, «оперуполномоченного», шыракаплечага, з добрым і выразна ліловым носам мужчыну, — спачатку па чарзе — усе прыместачковыя вёскі, а потым, здаецца, за сто рублёў (цяперашніх дзесяць) нанялася дзяжурыць мая маці. Я, ужо 15-гадовы падлетак, і стаў падмяняць яе на гэтым дзяжурстве, асабліва начным.

Але да тых восеньскіх далёкіх дзён з першым снегам мне хочацца вярнуцца ўжо праз апавяданне.

***Нядзеля, 22 лістапада 1987 года.***

Белы сняжок на дахах, белая, прыцярушаная ім зямля, чорныя дрэвы, якія пахіствае вецер, сіні вечар. Я нарэшце сеў за стол. Так змарнаваўся пасля майго шчырага гасцявання цэлы дзень. Не берагуся.

***Чацвер, 26 лістапада 1987 года.***

Усю ноч, як на згоне зімы, змыты дажджом, шаргацеў з грукатам у вадасцёчных трубах лёд. У серабрыстых кроплях дажджу і сёння шыбы майго акна. Учарашні густы туман, з'еўшы снег, сёння трохі адсланіў свет.

Учора творчы вечар прозы быў толькі для нас, празаікаў, што чыталі свае ўрыўкі (я малюнак з «Фаіны Грамычынай») — у зале сядзела чалавек сорак студэнтаў.

На чорным бітумным даху, не падзяліўшы костку, б'юцца, падлятаючы, дзве сівыя вароны.

***Нядзеля, 29 лістапада 1987 года.***

Пятая гадзіна ночы, а я не сплю і таму прыйшоў у свой кабінет і сеў за стол. Перадумалася даўняе-варакомскае: дзе былі і цяклі ў рэчку, а цяпер павысыхалі крыніцы, дзе і якія высахлі і зніклі завоіны. Усё даўняе адышло, адышлі і людзі, якія жылі поруч з гэтымі крыніцамі і завоінамі.

Учора цэлы дзень у бібліятэцы, перачытваў і перапісваў з Археаграфічнага зборніка справу Фаіны Грамычынай, а цяпер уявіў стос дроў на заснежаным полі і яе, прывязаную да слупа, што канала ў полымі.

Ці пашанцуе перадаць гэтую сцэну. Сцэну болю, пакуты і трагізму — фінал драмы.

***Панядзелак, 30 лістапада 1987 года.***

Чуюся хваравітым і нездароўчым — да паўночы не сплю. Як пісаць, калі дрэмлеш над сталом. «Перыну падняць і то цяжка», — так скардзілася некалі маці, і я ўсё больш і больш разумею яе цяпер.

Сівы, азызлы і халодны туман каторы дзень вісіць над горадам.

Учора займаўся справаздачаю то для бюро секцыі, што маецца быць сёння, то пісаў біяграфічную даведку для Пяткевіча (ён дае звесткі пра мяне ў нейкі энцыклапедычны даведнік).

**Казімір Камейша**

# ПА ЛІТФОНДАЎСКАЙ ПУЦЁЎЦЫ

*Працяг. Пачатак у № 7, 8 за 2023 год.*

## ІСЛАЧ

Прымітыўная рыфма «Іслач — Свіслач», у адрозненне ад ставераўскай «Мінск — Пінск», выйграе ўжо тым, што нагадвае чытачу творчыя хвалі руху не толькі вады, але і думкі, часу, пошуку, ды і ў гучанні яе ёсць нейкі птушыны перасвіст блізкіх табе мясцін, зыкі сцюдзёнага ветру і завеі, нават перашэпт лісця. Можна спрачацца над тым, у чым уступае адна рака другой. У Свіслачы, вядома ж, шмат сталічнага гонару, нават вялікасці. У Іслачы, магчыма, менш глыбіні, але больш закрутаў і чысціні. Нездарма ў ёй водзіцца стронга. Нават гучанне ў гэтай рыбы зусім паэтычнае. Стронга ўдачы тут абавязкова павінна сама шукаць і напаткаць паэта. Колькі разоў праязджаў я ля гэтага ляснога ўскрайку бліз Ракава і амаль ніколі не звяртаў на яго ўвагі. Ніхто наперад не ведае, дзе можна адшукаць той райскі куточак, які тут жа ўхваліць твая душа. Ведаю, што мясціну гэту доўга шукалі тыя людзі, якім тое было даручана. Шукалі, каб была яна зусім блізка ад Мінска, каб было ў ёй дастаткова паэтычнай экзотыкі, не дужа пакрыўджанай чалавекам прыроднай прыгажосці, каб у сэнсе цішыні не ўступала яна тым жа Каралішчавічам. Дапамаглі, напэўна, і акадэмікі. Недзе побач размяшчаўся іх,ranаўцаў (Нацыянальная акадэмія навук) санаторый. Ракаўскія кірмашы ды вядомая «таўкучка» яшчэ не надта вытапталі тутэйшыя мястэчковыя ўскраіны, старую брукаванку ўжо даўно змяніла гладкая асфальтоўка, і гэты заходні гродзенскі кірунак быў аднагалосна абраны месцам будучага будаўніцтва. Старалася былое вышэйшае начальства дагадзіць пісьменнікам: вунь які Дом літаратара ўзвялі ў самым цэнтры сталіцы для тых самых «інжынераў чалавечых душ», і тут жа для іх творчасці і адпачынку пачалі будаваць цэлы замак. Пішы, браце, ды радуйся, але найперш радуй свайго чытача! Партыя стараецца для цябе — не спі ў шапку і ты!..

Новы Дом творчасці будаваўся і сапраўды ў нейкім мудраватым замкавым стылі. Гэта я потым адчуў, калі прыехаў сюды са шчаслівай пуцёўкай Літфонда ў кішэні. У першы дзень свайго знаёмства з Домам я, павячэраўшы, яшчэ да той самай чарчыны «за прыезд», доўга не мог патрапіць у свой нумар, усё блудзіў, хадзіў па нейкім крузе, трапляў то ў більярдную, то ў нейкі тупіковы закутак, а дзвярэй сваіх не знаходзіў. А што ж я хацеў — замак! Ён хай і без прывідаў, а лабірынты свае мець павінен.

На першы наш іслацкі суботнік той жа Пятро Стэфановіч хоць і частаваў яшчэ бярозавікам з бяроз Каралішчавіцкіх, але ўжо «гжэчна» адкланьваўся вербам і хвойкам Іслачы, падкрэсліваючы ўсюды і свой удзел у будаўніцтве гістарычнага аб’екта. Тугі асаблівай па славутых Каралішчавічах у яго вачах не адчувалася.

Тутэйшыя жыхары ледзь не з гонарам гаварылі пра з’яўленне пісьменіцкага Дома. Бо ён жа некаторым з іх даваў тыя самыя цеплаватыя рабочыя месцы. Новыя жыхары Дома давалі зарабіць і мясцоваму гандлю. Слова «пісьменнік» усё часцей загучала ў людных месцах у размовах тутэйшых кабет. Ля аўтобуснай пачакальні чуў, як жанчына (напэўна, з абслугі Дома) распавядала сваім суразмоўкам пра панскае жыццё пісьменнікаў у сценах незвычайнага творчага будынка. Хваліла ўтульнасць і камфорт пакояў, цеплыню ў тых пакоях. Не верылі тыя, што ў пакоях Дома нават сама падлога з падагрэвам. Клялася пад заклад, што так яно і ёсць на самай справе, а тыя ёй не верылі: «Ой, казкі ты нам баеш, Маня!» Я ледзьве стрымліваўся, чуючы гэта, хацелася дапамагчы жанчыне, пацвердзіць справядлівасць яе слоў. Падлога ў пакоях сапраўды была з падагрэвам. Відаць, гэта акалічнасць не спадабалася адчайнаму маладому паэту, і той вырашыў арыгінальным чынам выкарыстаць свой пратэст супраць такіх пешчаў творчага брата. Вечарам ён басанож, каб усе бачылі, пагайсаў па свежым снезе (днём на тое рашучасці не хапіла) вакол Дома. Дакладна адрукаваныя маладыя сляды назаўтра са здзіўленнем чыталі ўсе адпачыванцы творчага дома. Угадвалі, але так і не адгадалі, каму належаць надта прыгожыя малюнкі чалавечай ступні. Можна і гэтак пакінуць свой след у літаратуры. Вось жа згадалася і мне раптам праз колькі там дзесяцігоддзяў.

Няма сумнення, што беларускі Дом творчасці будаваўся з таго самага меркавання, каб дагадзіць пішучаму брату. Ну і было спадзяванне, што паедуць сюды тварыць нястомнікі з усяго неабсяжнага вялікага Саюза. Немалыя былі ўкладзены на тое сродкі з багатага кашалька ўсесаюзнага Літфонда. Аднак літфондаўскія спадзяванні не спраўджваліся. І тварыць, і адпачываць ехалі на іслацкі бераг неахвотна. Некалькі катэджаў ля Дома дапамагалі запоўніць прафсаюзы, камфортныя нумары ўнутры Дома пісьменніцкай браціяй запаўняліся незаўсёды. Не адчувалася «каралішчавіцкага смаку» і на самой домавай кухні. Ды і ў вялікай краіне тварылася штосьці не тое. Словам, не паспелі яшчэ як след абжыцца ў новых сценах, а ўжо з’явіліся прадчуванні хуткага развітання з імі. Магчыма, мне так здаецца толькі здалёку, з дня сённяшняга. Але тады мы жылі тым часам, у якім жылі. І, вядома, радаваліся таму, што маем. А чуткі пра нібыта цяплічныя, амаль райскія ўмовы пражывання ў пераемніка Каралішчавічаў пайшлі шырока сярод членаў пісьменніцкага Саюза, перакінуліся і на іншыя творчыя згуртаванні. Памятаю, сам я, седзячы ў сваім 22-м пакоі, пачуваў сябе нібыта на сярэдзіне нейкага дзіўнага заплыву: справа ў мяне, за спінай, трапяталася, гуло крыло вялікага сталічнага горада, злева, калі глядзець у акно, праз зеленакрылыя абсягі Налібоцкай пушчы, праглядваўся родны дом, нават бачыўся яго, вымыты даждждамі, шыферны дах. Сама Іслач з высокага акна Дома выглядала нейкім віхлястым ручаём, і яе прысутнасць падкрэслівалася толькі хіба густаватай алешнікавай ды арэхавай зелянінай берагоў, якая паўтарала іх натуральную крывізну ды толькі збольшага нагадвала пра рух далёкай вады. Не сядзелася, не чыталася, нічога не пісалася ў цёплым, модна, нават крыху вычварна выбудаваным пакоі. Я даўно ўжо зразумеў, што руху ў прыродзе ды і наогул у жыцці шкодзяць тры гамульцы (гамульцамі ў нашых мясцінах называюць тармазы): **застаяласць, заляжаласць** і **засядзеласць.** Гэта даўняя думка і змушае мяне рухацца. Таму адкладваю ўсё, пачатае на тым творчым стале, і іду паразмаўляць з ракой. А тут сум мой толькі ўзмацняецца. Не надта мы клапоцімся і пра нашы вялікія рэкі, але як занядбаныя і тыя ма-

лыя, якія пакінуў нам час, не аддаўшы іх пад плуг былога вялікага спрамлення. Хай бы тыя будаўнікі, што ўзводзілі на гэтым лясным беразе непаўторны «творчы замак», хоць колькі ўвагі ўдзялілі і самой рацэ, падумалася раптам, хай бы пачысцілі, прыбралі, «пасуботнічалі» на самім беразе, дапамаглі нечым плыні. Дык не, яны ўзялі сабе толькі назву ў ракі, а ў астатнім — цячы як хочаш ці як можаш. Плынь у тым самым месцы ля дварышча Дома нагадвае стыхійны малаводны ручэй. Перашкодай на плыні і там, і сям ляжаць нейкія рэшткі старых дрэў, відаць, падмытых веснавой паводкай, падгнілая старая лаза ці арэшына. З жаўтавата-шэрага набярэжнага лужка, густа ўсеянага чорным кратавіннем, правы, стромісты бераг, што кіруецца ў напрамку Івянца, выглядае сонечным і светлым. А я стаю насупраць свайго акна і шукаю для сваіх вачэй таго промня, які рассячэ гэту лясістую плынь і даляціць да акна іншага, што ў маёй навікоўскай бацькоўскай хаце. Напрамкі яно і не так далёка. Прамень адсячэ ўбок шмат большых і меншых вёсак, адцісне ўбок нават Івянец і Рубяжэвічы, перасячэ Валмянку і Сулу і праз Граньскі хутар апынецца ў маіх Малых Навіках, нават не зачапіўшы Навікі Вялікія. Думкі мае, не надта і вясёлыя, бягуць наўпрост, перасякаюць кроны і далягляды, рэкі і дарогі. Я, здаецца, на свае вочы бачу наша пушчанскае дварышча. Вунь пратупала з вядром да студні мама, а бацька з самай раніцы тупае ля сваіх вулляў, распальвае дымар, пыхкае ім у паветра і зараз будзе здымаць стрэшку вулля, вымаць заліплыя воскам рамкі, праглядваць іх на сонца і зноў вяртаць на сваё месца. А мяне там няма, я нібыта староннi чалавек, стаіўшыся, толькі назіраю за ўсім гэтым.

Красавіцкі сонечны дзень парадаваў добрым першавеснавым цяплом, ажно добра прагрэліся лясныя паляны. На маім рабочым стале ляжыць і патрабуе маёй прысутнасці сшытак з пачатай паэмай пра Язэпа Драздовіча, але ў свой пакой вяртацца пакуль што мне не хочацца, цягне да сябе лес. І пасля снядання мы з Яўгенам Курто збіраемся падацца ў бок івянецкай дарогі, да верасовага ўзлесся. Там я надоечы адшукаў кветку-сон. Гэта самая любімая мая лясная кветка. Калі яна зацвітае, яе мяккі аксамітавы блакіт можа тварыць з душой і памяццю якія хочаш дзівосы. Кветкі гэтыя чамусьці хараша і зваблiва растуць на ўзлесках уздоўж дарог. Калі залатым сонейкам высвечваецца іх тычынкавая сярэдзінка ў блакітнай жменьцы пялёсткаў, я заўсёды згадваю сваю дарогу дзяцінства, якая вяла мяне з дзедаўскага хутара Астравы ў бацькавы Малыя Навікі. Там, перад Калатоўкай, дзе некалі высіўся панскі маёнтак, пры дарозе, на хвойным узлессі, кветкі сну глядзелі на мяне ўсімі сваімі здзіўлёнымі вачыма і запрашалі спыніцца. І надта ж кранала мяне гэта загадкавая прыгажосць і штосьці ж навявала дзіцячаму сэрцу. Тое і сёння застаецца невыказным, а тады нібыта і размаўляла са мной. Цяпер жа адна дарога вяртала мяне да дарогі другой, той далёкай, якой сёння ўжо і не існуе. На гэтай жа дарозе, якая цяпер звязвала дзве суседнія краіны, ні на хвіліну не спыняўся рух, круцілі свае колы вялікія і малыя машыны, а побач, пакліканыя сонцам, палалі, цвілі, глядзелі на нас незвычайныя кветкі. Я колькі разоў спрабаваў прыручыць кветку-сон да свайго вясковага дварышча, а потым і да лецішча, але яна не пагадзілася са мной, не захацела цвісці там, дзе ёй паказвала рыдлёўка. І, напэўна, правільна зрабіла. Навошта ёй такое зняволенне! Красавіцкае сонца паабяцала нам добры дзённы настрой, і ў свае пакоі мы вярталіся з маленькімі блакітнымі букецікамі. Неўзабаве яны маркоціліся ў нашых пакоях у шклянках побач з нейкімі незразумелымі для іх кнігамі. Яўген

Курто назаўтра пакінуў наш Дом, скончыўся тэрмін яго пуцёўкі. Я праводзіў калегу да аўтобуснага прыпынку. Здаецца, свой букецік пісьменнік прыхапіў з сабой. Развітваючыся, ён раіў мне часцей выходзіць у лес, бо ён, хваёвы, вясной да ўсяго яшчэ і добры доктар.

Пасля наведвання кветкавай паляны надта свежа і далікатна было на душы, і мне зноў захацелася прысесці за мой рабочы стол, дзе крычала сваім пачаткам даўно задуманая паэма. Спяваць бы мне цяпер песні пра тыя самыя кветкі, але ў маёй яшчэ не напісанай паэмы быў іншы матыў, надта сумны, лёсавы. Я стараўся пранікнуцца ў жыццё надта складанага лёсу чалавека, мастака, вандроўніка, пакутніка Язэпа Драздовіча. Я і сам цяпер нібыта адчуваў сябе ў ролі мастака, муштраваў сваё ўяўленне. Маляваць партрэт мастака мне хацелася тымі ж самымі штрыхамі, якіх патрабавалі само жыццё і лёс майго героя. Я ўжо шмат чаго ведаю пра гэтага чалавека з кнігі Арсена Ліса, з дзённікаў самога Драздовіча, якія мы пачалі друкаваць у «Маладосці». Матэрыялу як быццам хапае. Але мне хочацца прайсціся дарогамі самога вандроўніка. Неяк я прызнаўся пра сваю задуму Яраславу Пархуту, «мудраму Яраславу», як я назывў яго, і мы разам вырашылі адправіцца ў тое падарожжа, але не пешшу, а на маіх «Жыгулях». Вядома, сам Драздовіч пасмяяўся б з нашай задумы. Ён свой творча-вандроўны шлях пражыў і выпакутаваў, а мы проста прагуляліся на сучаснай машыне па старых прыазёрных дарогах. Спачатку наведалі Полацк, павыступалі там у нейкіх калектывах, а потым выправіліся на Глыбоччыну. Вось знешні летні партрэт мастака, які нам намаляваў адзін з тых, хто памятаў Драздовіча на пачатку трыццатых гадоў мінулага стагоддзя, чалавек з мастацкім дарам Фёдар Іванавіч Сухавіла. Быў Драздовіч танклявы, хударлявы, галавой сівахаты, з маленькімі вусікамі. Апрануты ва ўсё палатнянае: порткі і фрэнч. У выцвілым брылі з вялікім выгінам. Абапіраўся на кій з чалавечай галоўкай уверсе.

Паэма, што добра вымалёўвалася ў задуме, цяжка ішла на паперы. Ды і не дужа я змушаў сябе быць прыкаваным да стала і паперы. Цягнула на прыроду. «Не сядзіцца ў Доме творцу не старому: Цягне яго Іслач і над ёю строма», — перастварыў я жартам радкі класіка. Строма, ці своеасаблівы ўцёс існавала на берагавым ускрайку лесу, які ўзгорыста падымаўся ў напрамку Івянца. Той уцёс не ўступаў у сваёй кідкасці таму волжскаму з вядомай песні. Ён зманліва глядзеўся знізу ад самага берага. Думнае ўражанне пакідала і сасна над абрывам, яе голыя карані, абветраныя і абмацаныя зімовымі вятрамі. Сасна яшчэ добра трымалася астаткам каранёў за выступляснога ўзгорка. Зверху ў сваю чаргу добра праглядаўся шырокі арэшнікавы ніз, разам з ракой, лугам і тым самым чорным кратавіннем на ім. Недзе там, удалечыні, былі відаць стрэхі блізкай вёскі. Адкрывальнікамі гэтай мясціны трэба лічыць Алеся Савіцкага і Уладзіміра Скарынкіна. Яны прыдумалі там, на самай вышыні, нейкае седзішча, узвялі нават будан, дзе можна было схавацца ад дажджу. Будан той даўпрыгожвалі нейкія жалязякі, стары посуд. Усё гэта атрымала назву, якая сама спаўзла з тэлеэкранаў і прыжылася, — «Фазэнда». На ўцёсе не астывала вогнішча, смажылі шашлыкі, цалаваліся, сумавалі і радаваліся. Касцёр, што часта пылаў на стромістым беразе, кідаў свой вясёлы бляск у цемнаватую лясістую далеч. Ён, напэўна, хораша і зваблівa глядзеўся адтуль, з прырэчных нізоў. Калі я і сёння распальваю ў сваім вясковым двары маленькае вечаровае вогнішча, мне заўсёды здаецца, што адтуль, з-пад Ракава, яму падміргвае

знаёмы касцёр з Дома творчасці «Іслач». Але мне гэта толькі здаецца. Сёння, калі я пішу гэтыя нататкі, Дома творчасці, дзе з панскім размахам адпачывалі і тварылі мае калегі-пісьменнікі, проста не існуе. Яго напаткаў лёс Караліш-чавічаў. Але не хочацца чытача засяроджваць адразу на нечым сумным, пакі-нем яго на потым. Пакуль што я дайшоў толькі да іслацкага кастра. Ён яшчэ толькі пачаў разгарацца і, магчыма, хутка будзе не менш вядомым, чым той каралішчавіцкі. Калісьці той разгарэўся са шчаслівай запалкі Міхася Лынькова і потым па сваёй вядомасці не ўступаў бадай ніводнаму твору, што пісаліся ў сценах Дома творчасці імя Якуба Коласа. Ля вытокаў іслацкага агню пашанца-вала апынуцца і мне. Іслацкі пачынаўся з майго сумнага верша, які тут жа быў надрукаваны ў «ЛіМе». Алесь Савіцкі, які меў фенаменальную памяць, цытаваў мне мае радкі пры сустрэчы на памяць:

На Іслачы гасне зара,
Гарыць касцёр на уцёсе,
Вячэрняй трывогай гарацъ
Настылыя макаўкі сосен.
Падкінем яшчэ сушняку,
І полымя выхапіць з ночы
І сцежку, і лес, і раку,
І вашы стамлёныя вочы.
Цыганскім гарачым брывом
Здаецца і ўцёс гэты стромы.
Цыганскаю воляй жывём,
Не кліча нас воля дадому,
Бо там не чакаюць даўно.
Чакаць — гэта ноша цяжкая,
Бо там гэтай волі лясной,
Як сцежкі па ночы, шукаеш.
Згадаюцца дні і сябры
У гэтай дымлівае процьме.
Усё на душы адгарыць,
У здані, у цені пяройдзе.
І здымачак гэты зямны
З агнём і паўзмрокам гарачым
Ніколі не прыйдзе у сны,
Ніколі ніхто не пабачыць.
Упрысядкі скача,
трашчыць,
Гарыць касцёр на уцёсе.
Надломлены кій маўчыць,
І штосьці надломлена ў лёсе.

Не ведаю, чым крануў гэты верш душу празаіка, а для мяне ён быў надта асабістым, навеяны нейкай сямейнай безвыходнасцю, можа, і не зусім тупіко-васцю. Гэта тое, ад чаго чалавецтва яшчэ не прыдумала аніякага страхавання. Проста я, чалавек лясны, шукаў сваё выйсце ў падстрахоўцы лесу. А лес быў падобны да майго, граньска-навікоўскага. Бо тут, пры Іслачы, усё ці ўзлессямі, ці падлескамі, ці палянамі, ці самім рэхавым адгалоссем, — усё наша, пушчан-скае. Словы Яўгена Курто, дзе ён нахвальваў надыслацкі хвайняк за тое, што ён супакойвае яго хворае сэрца, я тады прапускаў міма вушэй, не тое што не давяраў ім, проста ў той час яшчэ не верыў ані ў якія хваробы. Сёння я сам кожную раніцу хаджу ў свой бліжні лес, і ён замяняе мне таблетку эналапрылу,

здымае мой гіпертанічны ціск. Шмат хто не паверыць і гэтаму майму прызнанню, але гэта так. Тады прырэчны іслацкі лес вяртаў мне шмат чаго бяздумна страчанага, і я яму быў за гэта ўдзячны. Прыдзірлівы чытач адразу захоча даведацца, што я маю на ўвазе пад «бяздумна страчаным». А як інакш назавеш тое, што збіралася па кроку, па дэталі, па кадрыку ў гады пасляармейскія (я нейкі час працаваў у валожынскай райгазеце), што недаравальна мала занатоўвалася ў запісоўкі, бо яго абяцала трымаць у сваіх шуфлядах мая маладая памяць, а яно раптам зусім знікае як зусім непражытае? З ім разам знікаюць і мае грыбныя падарожжы на івянецкія бальшакі ў сябрыне з многімі нашымі старэйшымі пісьменнікамі. Знікае тое, што не павінна ні ў якім разе знікаць, бо яно ўжо нібыта часціна цябе самога. Але ёсць Іслач, ёсць пры ёй цудоўны лес, ёсць харошыя сцяжыны ў гэтым лесе і харошыя людзі, якія па іх ходзяць. Яны мне і вяртаюць тое, што я некалі праз сваю летуценнасць страціў.

Калі я першым разам завітаў у новы Дом творчасці, быў гэта красавік 1987 года, у паветры ўжо добра дыхнула вясной, снегу нідзе не было, на баравым узлессі яркім блакітам здзіўлялі пралескі і мая любімая кветка-сон, бадзёра выспеўвалі птушкі. У спевах шпакоў, якія ўмеюць лёгка імітаваць чужыя галасы, чуліся і бадзёрыя акорды дразда. Яшчэ добра не асвойтаўшыся з усімі выгодамі свайго пакоя, я хадзіў па ціхім і ўжо прагрэтым першым цяплом узбярэжжы, якое бачыў і ведаў толькі здалёку, толькі збольшага, назіркам. Усё новае, вядома ж, хацелася параўноўваць з былым, з тым, нядаўнім каралішчавіцкім. Нечага ўсё ж не хапала мне ў гэтай вясне, гэта добра адчувала мая зазімелая душа. А чаго, я яшчэ не ведаў. І толькі калі ўпотырч выйшаў да немаладой, крыху схілёнай бярозы, зразумеў: не хапае мне тут бярозавіку. На бярозы тут было беднавата. Іх нібыта хаваў ад пабочнага вока хваёвы бор. Адразу выспела і задума: свой прыезд я адзначу не толькі нейкім моцным кілішкам, як гэта заўсёды рабілася ў Каралішчавічах, а кубкам салодкага бярозавіку. Але тут жа адразу ўзнікла і мноства пытанняў і праблем. Няма ў мяне ні начыння, ні нават посуду, які спатрэбіцца для ўсяго гэтага. Дакараў сябе: як жа я не падумаў пра ўсё гэта, калі выязджаў сюды з Мінска. Пошукі прывялі мяне пад дах абслугі, дзе гаспадарылі мужчыны. Тыя выслухалі і адразу зразумелі мяне. У лес я ішоў неўзабаве і з малатком, і стамескай, з канчура нейкай бляхі мы нарэзалі латакоў. А мяшэчкі поліэтыленавыя знайшліся ў маёй дарожнай сумцы. Крыху паблукаўшы па лесе, я выбраў для сябе столькі ж ствалоў, колькі ёсць дзён у тыдні. З усёй гэтай сямёркі самая шчодра-дойная аказалася тая, на якую я і набрыў на пачатку свайго знаёмства з лесам. Астатнія былі нейкімі скупаватымі. Відаць, сонца яшчэ не зусім адагрэла іх зазімелыя карані.

І вось мой малаток застукаў па касцяной рукаятцы стамескі, насцярожыў тутэйшага дзятла, які пярэста выпырхнуў з-пад радкаватых галін хворай хвоі. Не толькі ж яму аднаму абстукваць тутэйшыя ствалы. Потым я яшчэ згадаю пра мастацкія выштукаванні таго дзятла. А пакуль я засяроджаны на бярозавіку. І вось лёгкі блакітны струмень вырваўся з-пад вастрыя маёй стамескі і пырснуў нечым халодным у мой твар. Потым ён рассыпаўся на ланцужок хуткіх кропель, і яны паплылі ў прыладжаны да ствала мяшэчак. Вечарам у сталоўку я заявіўся з графінам салодкага блакіту. З яго і пачалося знаёмства з тымі, хто ўжо паспеў абжыцца ў лясным Доме. Першым маім бярозавікам пачаставаўся Паўлюк Пранузa. Нават зморшчыўся, як пасля чаркі моцнай, хоць адпіў салодкае. Можа, у гэтым і быў намёк на тое горкае ў паэта, якога

з лёгкай рукі Ведзьмака Лысагорскага ўсе цяпер за вочы называлі «нясвіжскім пасланцом», але яго надта пільна апякала жонка, ценем ходзячы за ім нават у прыбіральню. Дзякуючы бярозавіку той звычайнай вясны, сярод пісьменніцкай брацii я стаўся адразу вядомым. Такой вядомасці не абяцалі мне мае яшчэ не напісаныя творы. Знайшліся і тыя, хто захацеў падзяліць са мной мой клопат, запісацца ў памагатары, а то суаўтары маёй салодкай падсочкі. Не бачачы ў гэтай справе ніякай канкурэнцыі, я папярэдзіў іх, што на бярозы тутэйшы лес беднаваты, усе бярозы ўцяклі недзе пад Івянец. Але не мог я адмовіць у добрым пачынанні Авяр'яну Дзеружынскаму, з якім разам парыліся ў суботняй лазні, усе дні ў маім «промысле» браў удзел і Уладзімір Паўлаў. Усё тое салодкае салодка ўспамінаецца і сёння, праз гады і дзесяцігоддзі.

Пакідаючы «Іслач», у мае ранішнія дзверы пастукаўся ён, Паўлюк Прануза, падзякаваў мне «за кампанію» і пакінуў на маім стале верш, які з яго дазволу я потым уключыў у першую анталогію беларускай эпіграмы, якая выходзіла ў выдавецтве «Ураджай».

**ПАЖАДАННЕ**

*П.Прыходзьку, П.Пруднікаву,*
*А.Русецкаму, Я.Курто, К.Камейшу*

Каб нерушам грымелі вершы,
Каб пругкім быў, як сталь, радок,
Увішны, баявы Камейша
З бяроз выдойваў смачны сок.

На развітанне у гуморы
Сказаў. Запомнім назаўжды:
— Сок піце, ды не ліце ў творы
Ну аніякае вады.

*«Іслач». 1987*

Не ведаю, дзе працягваў свой звыклы вясновы промысел бярозавіку мой знаёмы Пятро Стэфановіч, а на іслацкім беразе я яго бачыў толькі на вышэйзгаданым суботніку. Тут, як я разумею, яму проста не было дзе разгарнуцца. Магчыма, не мяняў ён сваёй прапіскі ў каралішчавіцкім лесе ці адшукаў іншы беразнячок бліз Мінска. А я не магу паскардзіцца і на тыя нешматлікія бялянкі, што раслі пры сасновым прыгрэве там, ля Іслачы. Бяроза і клён для мяне — два святыя дрэвы. Праз іх і ачышчаецца штогод лясная душа чалавека. Вёсны бываюць і раннія, і познія, і цёплыя, і халодныя. Часам у канцы мая і ў пачатку чэрвеня кладзецца снег, агрызаецца мароз, але ніколі не бывае таго выпадку, каб вясна не парадавала чалавека глытком салодкагу кляновіку ці бярозавіку. Не, зусім не плачуць нашы бярозы, аддаючы нам свой сок, як гэта кажуць паэты. Плакаць трэба чалавеку, які, жывучы ў бярозавай вясне, не паспрабуе самага чыстага, жыццядайнага і ачышчальнага напою. Там, ля Іслачы, я часта згадваў і свой першы ў жыцці бярозавік. Дзіцячая памяць на ўсё жыццё зафатаграфавала тую веснавую раніцу. Мой хутаранскі дзядуля, у якога пазычылі і маё імя, Казімір Карлавіч клікнуў мяне адразу пасля сняданку да нашага ўзлесся. Лес у той пасляваенны час быў дзядулевай уласнасцю. Аберагалі ў ім кожны кусцік, кожную карынку. Пачынаўся ён адразу за гумном, клінам уразаючыся ў самае гумнішча. Гожыя бярозы-бялянкі раслі на самым ускрайку.